ресурсов в стране выглядит верным: необходимо, чтобы наши деньги работали на нас. С другой стороны существующие в республике финансовые инструменты совершенно не удовлетворяют запросам страховых организаций, особенно когда речь идет об инвестиции валютных резервов. Здесь необходимо также принять во внимание налогообложение курсовой разницы, возникающей при владении валютными активами. Если предприятие не обладает соответствующими валютными пассивами, то рост темпов девальвации, увеличивающий, с одной стороны, эквивалентный доход в белорусских рублях, с другой стороны увеличивает налогооблагаемую прибыль, что оборачивается дополнительными расходами. Поэтому фактическая доходность валютных инструментов крайне низка. Насколько — зависит от баланса каждой конкретной страховой организации.

© БГЭУ

# ВЫБАР НАКІРУНКУ ІНТЭГРАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў СУСВЕТНУЮ ЭКАНОМІКУ НА АСНОВЕ АНАЛІЗУ ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ

***А. А. ВЯЧЭРСКІ*, В. С. БЕЗУКЛАДАВА**

The results of foreign trade are very important for the Belarusian economy. Russian Federation and European Union are the main commerce partners of our country. During last ten years the Belarusian trade with Russian Federation is characterized by the export stagnation. The reason is an insufficient growth of the economic potential of Belarus, due to the lack of foreign direct investments from Russia. On the other hand, the trade with European Union reflects an important increase of exports, which unfortunately are mostly formed by oil products. So Belarus is risking becoming a raw materials-producing appendage of the EU. This situation can only be managed by the Belarusian integration with European Union and the income of foreign investments, which will make possible the modernization of its economical structure

Ключевые слова: тавараабарот, экспарт, імпарт, прамыя замежныя інвестыцыі, эканамічны патэнцыял

## 1. Уводзіны

Для Беларусі, як для кожнай краіны з малой адкрытай эканомікай, знешні гандаль мае першаступеннае значэнне. Наша краіна не мае значных уласных запасаў прыродных рэсурсаў, а таму моцна залежыць ад паставак сыравіны з іншых рэгіёнаў. Па прычыне нізкай ёмістасці ўнутранага рынку, значная частка прадукцыі прадаецца за мяжу і адтуль атрымоўваецца большасць сродкаў, неабходных для развіцця вытворчасці і нарошчвання патэнцыялу нацыянальнай эканомікі. Вынікі знешняга гандлю аказваюць, такім чынам, вялікі ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі і павінны быць асновай для выбару стратэгіі яе інтэграцыі ў сусветную эканоміку.

Двума магчымымі накірункамі інтэграцыі Беларусі ў сусветную эканоміку з'яўляюцца Расійская Федэрацыя і Еўрапейскі Саюз. Аналіз знешняга гандлю павінен паказаць, якая структура супрацоўніцтва з імі больш спрыяе развіццю беларускай эканомікі. Знешні гандаль з'яўляецца адным з фактараў пры выбары стратэгічнага знешнеэканамічнага партнёра Рэспублікі Беларусь.

## 2. Геаграфічная структура знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь

Для мэт гэтага даследавання патрэбны аналіз знешняга гандлю Беларусі не з асобнымі краінамі, а з рэгіёнамі сусветнай эканомікі, у прыватнасці, з Расіяй і Еўрапейскім Саюзам (*малюнак* 1).

З *малюнку* 1 вынікае, што з Расіяй і Еўрапейскім Саюзам ажыццяўляецца большая частка знешнегандлёвага абмену Беларусі. Галоўным партнёрам нашай краіны выступае Расійская Федэрацыя, тавараабарот з якой удвая перавышае тавараабарот з Супольнасцю. Другім па значнасці гандлёвым партнёрам Беларусі з'яўляецца Еўрапейскі Саюз. Прычым можна адразу адзначыць адрозненне ў структуры адносінаў з двума рэгіёнамі. Імпарт у гандлі з Расіяй значна перавышае экспарт, у той час як з ЕС назіраецца адваротная тэндэнцыя. Такім чынам, найбольш важнымі для аналізу з'яўляюцца тэндэнцыі ў гандлёвых адносінах Беларусі з яе асноўнымі партнёрамі – Расіяй і Еўрапейскім Саюзам.

## 3. Аналіз знешняга гандлю Беларусі з Расіяй

Расійская Федэрацыя – асноўны традыцыйны гандлёвы партнёр Рэспублікі Беларусь. Дынаміка знешняга гандлю з Расіяй у 1995–2004 гг. прадстаўлена ў *табліцы* 1.




*Мал. 1.* Геаграфічная структура знешняга гандлю Беларусі ў 2004 г., млн. USD: *1* – тавараабарот, *2* – экспарт, *3* – імпарт [1, с. 56, 68]




*Мал. 2.* Структура імпарту Рэспублікі Беларусь з Расіі ў 1995 г., %: *1* – мінеральныя прадукты, *2* – хімічная прадукцыя, *3* – тэкстыль, *4* – некаштоўныя металы, *5* – машыны, абсталяванне, механізмы, *6* – транспартныя сродкі, *7* – іншае [3, с. 243–258]




*Мал. 3.* Структура імпарту Рэспублікі Беларусь з Расіі ў 2004 г., %: *1* – мінеральныя прадукты, *2* – хімічная прадукцыя, *3* – тэкстыль, *4* – некаштоўныя металы, *5* – машыны, абсталяванне, механізмы, *6* – транспартныя сродкі, *7* – іншае [1, с. 44–52]

*Табліца 1*. **Знешні гандаль Беларусі, у тым ліку з Расіяй, у 1995–2004 гг., млн. USD**

| Год | Тавараабарот | | | Экспарт | | | Імпарт | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | З РФ | Доля, % | Усяго | У РФ | Доля, % | Усяго | З РФ | Доля, % |
| 1995 | 10366,8 | 5150,3 | 49,7 | 4803,2 | 2185,3 | 45,5 | 5563,6 | 2965,0 | 53,3 |
| 1996 | 12590,8 | 6546,5 | 52,0 | 5651,5 | 3024,4 | 53,5 | 6939,3 | 3522,1 | 50,8 |
| 1997 | 15990,0 | 9453,1 | 59,1 | 7301,2 | 4780,0 | 65,5 | 8688,8 | 4673,1 | 53,8 |
| 1998 | 15619,0 | 9278,5 | 59,4 | 7069,7 | 4608,1 | 65,2 | 8549,3 | 4670,4 | 54,6 |
| 1999 | 12582,6 | 6988,7 | 55,5 | 5908,9 | 3222,0 | 54,5 | 6673,7 | 3766,7 | 56,4 |
| 2000 | 15972,6 | 9314,8 | 58,3 | 7326,4 | 3710,1 | 50,6 | 8646,2 | 5604,7 | 64,8 |
| 2001 | 15737,0 | 9400,6 | 59,7 | 7450,6 | 3962,7 | 53,2 | 8286,4 | 5437,9 | 65,6 |
| 2002 | 17113,2 | 9899,4 | 57,8 | 8020,9 | 3977,1 | 49,6 | 9092,3 | 5922,3 | 65,1 |
| 2003 | 21469,2 | 12458,0 | 58,0 | 9964,3 | 4898,7 | 49,2 | 11504,9 | 7559,3 | 65,7 |
| 2004 | 30097,2 | 17605,5 | 58,5 | 13751,7 | 6463,0 | 47,0 | 16345,5 | 11142,6 | 68,2 |

[2, с. 129–131; 1, с. 56]

Аналізуючы дынаміку знешняга гандлю Беларусі з Расіяй, трэба адзначыць, што актыўны рост тавараабароту назіраўся да 1997 г. і працягнуўся толькі ў 2003–2004 гг. Спыненне росту тавараабароту ў 1998-2002 гг. можа быць растлумачана структурнымі складанасцямі і крызісам у Расіі. Трэба таксама адзначыць, што імпарт з Расіі расце апераджальнымі тэмпамі ў параўнанні з экспартам, прычым, як у абсалютных, так і ў адносных паказчыках. Калі ў 1997–1998 гг. назіралася прыблізная роўнасць паміж экспартам і імпартам у гандлі з Расіяй, то ў 2004 г. імпарт з Расіі пераўзыйшоў экспарт больш як у 1,7 раза. Такім чынам, пачынаючы з 1998 г., у гандлі нашай краіны з Расіяй назіраецца стагнацыя экспарту на фоне хуткага росту імпарту (гл. *табліцу* 1).

Апераджальны рост імпарту патрабуе больш дэтальнага вывучэння. Структура імпарту Беларусі з Расіі прадстаўлена на *малюнках* 2–3.

У структуры імпарту Беларусі з Расіі за аналізуемы перыяд адбыліся істотныя змяненні. Нягледзячы на пастаянны рост кошту і аб'ёмаў спажывання мінеральных прадуктаў з Расіі, іх доля ў імпарце паменшылася з 63,63% у 1995 г. да 40,56% у 2004 г. Гэта памяншэнне кампенсуецца за кошт росту долі некалькіх артыкулаў і, перш за ўсё, некаштоўных металаў і машын, абсталявання, механізмаў і іх частак. Доля кожнага артыкула ўзрасла за аналізуемы час амаль у два разы (гл. *малюнкі* 2–3). Гэту тэндэнцыю можна ахарактарызаваць як станоўчую. Узрастанне долі машын, абсталявання і механізмаў у імпарце спрыяе перааснашчэнню беларускай прамысловасці.

Структура экспарту Беларусі ў Расію ў 1995–2004 гг. істотна не змянілася, што звязана, па-першае, з існаваннем Саюзнай дзяржавы і падтрымкай традыцыйных сувязяў паміж гаспадарчымі суб'ектамі і, па-другое, з непатрабавальнасцю рынку Расіі, што дагэтуль дазваляе нам экспарціраваць значную долю прадукцыі высокай (тэлевізары, аптычныя прыборы, лекі і г. д.) і сярэдневысокай навукаёмістасці (транспартныя сродкі, хімічная прадукцыя і г. д.).

### 4. Аналіз знешняга гандлю Беларусі з Еўрапейскім Саюзам

Другім па значнасці гандлёвым партнёрам Беларусі з'яўляецца Еўрапейскі Саюз. Дынаміка знешняга гандлю з Супольнасцю прадстаўлена ў *табліцы* 2.

Аналіз *табліцы 2* паказвае, што, за выключэннем 1999 г., назіраецца пастаянны рост знешняга гандлю Беларусі з Еўрапейскім Саюзам у абсалютных паказчыках. У той жа час доля Супольнасці ў знешнім гандлі Беларусі істотна пачала павялічвацца толькі ў 2002 г. Прычым, у супрацьлегласць

гандлю з Расіяй, рост адбываецца за кошт экспарту. Доля імпарту з ЕС скарачаецца, нягледзячы на тое, што ў абсалютных паказчыках назіраецца некаторы рост. У 2004 г. на павелічэнне тавараабароту паўплывала пашырэнне Саюза, у склад якога ўвайшлі шэраг краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія былі нашымі важнымі гандлёвымі партнёрамі. Аднак прыведзеныя тэндэнцыі верныя і для Еўрайскага Саюза ў складзе 15 краін.

Растлумачыць прыроду апошніх змяненняў у гандлі з Еўрапейскім Саюзам можна з дапамогай аналізу структуры экспарту. Структурныя зрухі будуць разгледжаны на прыкладзе экспарту Беларусі ў краіны па-за СНД, паколькі іх можна лічыць агульнымі і для Еўрапейскага Саюза (*малюнкі 4–5*).

Структура экспарту Беларусі ў краіны па-за СНД у 1995–2004 гг. змянялася вельмі дынамічна. За гэты час доля мінеральных прадуктаў (у асноўным прадстаўленых прадуктамі пераапрацоўкі нафты) у экспарце ўзрасла з 8,17% да 52,15%, г. зн. у 6,4 разы. У той жа час адбылося значнае скарачэнне долі прадукцыі хімічнай і звязаных з ёю галін вытворчасці, долі тэкстыльных вырабаў, машын, абсталявання і механізмаў, а таксама транспартных сродкаў (гл. *малюнкі* 4–5). Такім чынам, прырода хуткага росту беларускага экспарту ў Еўрапейскі Саюз звязана з павелічэннем продажу мінеральных прадуктаў.

Аналізуючы гэтыя змяненні з пункту гледжання навукаёмістасці прадукцыі, можна зрабіць вывад, што за апошнія гады ў экспарце Рэспублікі Беларусь у краіны па-за СНД адбывалася памяншэнне долі прадукцыі сярэдневысокай навукаёмістасці (транспартныя сродкі, прадукцыя хімічнай і звязанай з ёй галін вытворчасці) на карысць прадукцыі сярэдненізкай навукаёмістасці (прадукты перапрацоўкі нафты). Гэта сітуацыя звязана, з аднаго боку, з тым, што ЕС амаль не прымяняе пошлін у адносінах да тавараў невысокай навукаёмістасці і стараецца абараніць свае высокатэхналагічныя галіны вытворчасці, а, з другога боку, з паступовай стратай канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі. Улічваючы «нафтавую прыроду» экспарту Беларусі ў краіны па-за СНД узнікае рэальная тэндэнцыя ператварэння нашай краіны ў сыравінны прыдатак развітых краін.

*Табліца 2.* **Знешні гандаль Беларусі з Еўрапейскім Саюзам у 1995-2004 гг., млн. USD**

| Год | Тавараабарот | | Экспарт | | Імпарт | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Аб'ём | Доля, % | Аб'ём | Доля, % | Аб'ём | Доля, % |
| 1995 | 1506,2 | 14,5 | 575,8 | 12,0 | 930,4 | 16,7 |
| 1996 | 1703,3 | 13,5 | 452,3 | 8,0 | 1251,0 | 18,0 |
| 1997 | 1924,2 | 12,0 | 492,6 | 6,7 | 1431,6 | 16,5 |
| 1998 | 2069,1 | 13,2 | 515,6 | 7,3 | 1553,5 | 18,2 |
| 1999 | 1847,9 | 14,7 | 526,3 | 8,9 | 1321,6 | 19,8 |
| 2000 | 1980,0 | 12,4 | 689,6 | 9,4 | 1290,4 | 14,9 |
| 2001 | 2092,6 | 13,3 | 821,6 | 11,0 | 1271,0 | 15,3 |
| 2002 | 2923,2 | 17,1 | 1440,3 | 18,0 | 1482,9 | 16,3 |
| 2003 | 4055,7 | 18,9 | 2279,0 | 22,9 | 1776,6 | 15,4 |
| 2004 (15) | 5540,1 | 18,4 | 3298,1 | 24,0 | 2242,0 | 13,7 |
| 2004 (25) | 8638,7 | 28,7 | 5240,4 | 38,1 | 3398,3 | 20,8 |

[4, с. 138; 1, с. 68]




*Мал. 4.* Структура экспарту Рэспублікі Беларусь
у краіны па-за СНД у 1995 г., %: *1* – мінеральныя прадукты,
*2* – хімічная прадукцыя, *3* – тэкстыль,
*4* – некаштоўныя металы, *5* – машыны, абсталяванне, механізмы,
*6* – транспартныя сродкі, *7* – іншае [3, с. 110–124]




*Мал. 5.* Структура экспарту Рэспублікі Беларусь
у краіны па-за СНД у 2004 г., %: *1* – мінеральныя прадукты,
*2* – хімічная прадукцыя, *3* – тэкстыль,
*4* – некаштоўныя металы, *5* – машыны, абсталяванне, механізмы,
*6* – транспартныя сродкі, *7* – іншае [1, с. 44–52]

**5. Сістэмны аналіз знешняга гандлю Беларусі з Расіяй і Еўрасаюзам**

Аналізуючы знешні гандаль любой краіны, трэба разумець, што ён павінен спрыяць павышэнню канкурэнтаздольнасці ўсёй эканомікі ў цэлым. Рэспубліка Беларусь – краіна з пераходнай эканомікай. Ва ўмовах рэструктурызацыі вытворчасці асаблівае значэнне для нашай краіны набывае імпарт, які павінен забяспечыць мадэрнізацыю прамысловасці і, тым самым, рост экспартнага патэнцыялу. Трэба адзначыць, што новыя і высокія тэхналогіі, інавацыі і сучаснае абсталяванне, неабходныя беларускай прамысловасці, належаць у асноўным не Расіі, а Еўрапейскаму Саюзу і іншым індустрыяльна развітым рэгіёнам. Таму карэнная мадэрнізацыя беларускай прамысловасці можа адбыцца толькі шляхам інвестыцый у імпарт абсталявання і тэхналогій з Еўрапейскага Саюза. Мадэрнізацыя прамысловасці з цягам часу забяспечыць рост экспарту Беларусі, які спачатку прыйдзецца на расійскі рынак, які з'яўляецца не вельмі патрабавальным і на якім беларускія экспарцёры не стрымліваюцца ні мытнымі, ні колькаснымі абмежаваннямі. Затым адбудзецца выраўноўванне экспарту і імпарту ў гандлі з Еўрапейскім Саюзам.

Трэба канстатаваць, што структура знешняга гандлю Беларусі не адпавядае сёння гэтай мадэлі і мэце мадэрнізацыі ўвогуле. Істотнага імпарту з краін Еўрапейскага Саюза не назіраецца, а экспарт у развітыя краіны ўсё больш і больш набывае нізкатэхналагічныя рысы. У той жа час назіраецца ўстойлівае памяншэнне долі экспарту ў Расію ў агульным аб'ёме экспарту рэспублікі. Гэта адлюстроўвае страту канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі на расійскім рынку. Такім чынам, тэндэнцыі ў структуры знешняга гандлю Беларусі можна ахарактарызаваць як адмоўныя.

Прычына такой сітуацыі крыецца ў звышарыентаванасці эканомікі Беларусі ў бок Расіі. За гады актыўнага супрацоўніцтва Беларусь не здолела нарасціць свой агульнаэканамічны патэнцыял. Рэальная інтэграцыя нашых краін спынілася на этапе аднаўлення страчаных у выніку распаду СССР кааперацыйных сувязяў. Для нарошчвання знешнегандлёвага патэнцыялу эканоміка Беларусі патрабуе мадэрнізацыі, а значыць інвестыцый, якія Расія нам у патрэбным аб'ёме ва ўсе галіны даць не здольная (*табліца* 3).

Такім чынам, нават улічваючы ўзровень эканамічнай інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй, памер інвестыцый з Расіі з'яўляецца нездавальняючым. У той жа час пры адсутнасці актыўнага дыялогу з Еўрапейскім Саюзам адтуль адбываецца прыток інвестыцый, значна большы за расійскі (гл. *табліцу* 3). Гэта можна растлумачыць тым, што расійская эканоміка сама адчувае вострую патрэбу ў замежных інвестыцыях, а таму даць іх нашай краіне не можа. Адсюль узнікае вывад аб неабходнасці пашырэння супрацоўніцтва, у тым ліку гандлёвага, з Еўрапейскім Саюзам.

*Табліца 3*. **Размеркаванне назапашаных у Беларусі на 1 студзеня 2005 г. замежных інвестыцый па краінах**

| Краіна | Аб'ём, млн. дол. ЗША | Доля ў агульным аб'ёме, % |
|---|---|---|
| Усяго | 1716,9 | 100 |
| Расія | 267,5 | 15,6 |
| Германія | 293,1 | 17,1 |
| Велікабрытанія | 146,7 | 8,5 |
| Нідэрланды | 143,5 | 8,4 |
| ЗША | 131,0 | 7,6 |

[5, с. 23]

**6. Заключэнне**

Значная вага Расіі і Еўрапейскага Саюза ў знешнім гандлі Рэспублікі Беларусь патрабуе спецыфічных адносінаў з гэтымі рэгіёнамі. Ад структуры гандлю з імі залежыць стан эканомікі Беларусі і яе перспектывы. Аналіз паказвае, што знешні гандаль рэспублікі не адпавядае сённяшнім патрэбам нашай эканомікі. Для паляпшэння структуры знешняга гандлю і росту агульнаэканамічнага патэнцыялу патрэбна актыўнае супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам у гандлёвай і інвестыцыйнай галінах. Патэнцыял прыцягнення інвестыцый і закупкі інвестыцыйных тавараў з Еўрапейскага Саюза яшчэ далёка не выкарыстаны. Для вырашэння задачы мадэрнізацыі прамысловасці патрэбны якасна новы этап супрацоўніцтва з Еўрапейскім Саюзам пры захаванні адносінаў з Расіяй як аднаго з прыярытэтаў знешнеэканамічнай палітыкі. Такім чынам, інтэграцыя Беларусі ў сусветную эканоміку з'яўляецца мэтазгоднай праз інтэграцыю з Еўрапейскім Саюзам.

**Літаратура**

1. Внешняя торговля Республики Беларусь за 2004 г. (предварительные данные) / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. Мн.: 2005. 165 с.
2. Статистический бюллетень: январь-март 2004 / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. Мн.: 2004. 187 с.
3. Внешняя торговля Республики Беларусь 1995–2000 гг.: Стат. сборник / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. Мн.: 2001. 373 с.
4. *Гулида О. Е., Тамашевич В. Н.* Статистические материалы // Белорусский экономический журнал. 2004. №2. С. 136–147.
5. *Панкевич С.* Инвестиции. К нам и от нас // Национальная экономическая газета. 2005. №12. С. 23.